Гарбузаў, А

# ВЕРНАСЦЬ МАРЫ

Падлеткам Міхаіл Піліпенка марыў стаць настаўнікам, вучыць дзяцей у роднай Дуброўцы – вёсцы на маляўнічых берагах ракі Беседзь, на стыку магілёўскіх і бранскіх лясоў у Хоцімскім раёне. Калі здаваў экзамены за дзесяцігодку, здавалася – да мары рукой падаць. Планы перакрэсліла вайна. У няпоўныя семнаццаць гадоў разам з бацькам Карнеем Яўсеевічам добраахвотна прыйшоў Міхаіл на прызыўны пункт. І ўжо 22 ліпеня 1941 года атрымаў баявое хрышчэнне пры знішчэнні варожага авіядэсанту. Сувязістам-разведчыкам змагаўся пад Старой Русай, Дзямянскам, удзельнічаў у Арлоўска-Курскай бітве, Корсунь-Шаўчэнкаўскай аперацыі, двойчы фарсіраваў Днепр.

Бітва за Днепр, бадай, самая яркая вяха ў біяграфіі франтавіка. Першы раз трэба было адцягнуць увагу ворага ад напрамку асноўнага ўдару. Дзень пратрымаліся нашы воіны на правым беразе і задачу сваю выканалі паспяхова.

Другі раз давялося пераадольваць магутную водную перашкоду на поўнач ад Кіева. Фашысты люта контратакавалі 163-ю стралковую дывізію, якая расшырала захоплены плацдарм непадалёк ад Люцежа. Камандзір аддзялення сувязі Міхаіл Піліпенка ліквідаваў абрыў на лініі і вярнуўся на свой НП, які быў размешчаны ў захопленым доце. У шчыліну сувязіст убачыў, што на яго ідуць танкі з чорнымі крыжамі, за якімі паўзуць ланцугі пяхоты.

І ён перадаў каардынаты цэлей артылерыстам. Зямля вакол дота ўздыбілася ад разрываў снарадаў. Загарэўся адзін танк, другі, варожыя салдаты кінуліся ўрассыпную.

– Так і біце, – удакладніў Піліпенка палкавому КП.

Контратака гітлераўцаў была адбіта. Крыху пазней камандзір дывізіі Ф. В. Карлаў абняў салдата:

– Дзякуй за храбрасць. Па табе, Піліпенка, біла восем артылерыйскіх палкоў.

За гераізм і мужнасць, праяўленыя пры фарсіраванні Дняпра, М. К. Піліпенка быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. У тым жа 43-м стаў камуністам.

Вышэйшую ўзнагароду Радзімы вясной 1944 года ў Маскве ўручаў М. І. Калінін. Перапоўнены радасцю і яшчэ не зусім ачуняўшы пасля такой незабыўнай сустрэчы, Міхаіл Карнеевіч накіраваўся да начальніка Галоўнага ўпраўлення сувязі Чырвонай Арміі. Па дарозе думаў: навошта спатрэбіўся такому высокаму начальству?

Маршал войск сувязі І. Ц. Перасыпкін павіншаваў з узнагародай. Пацікавіўся жыццёвымі планамі.

– Як і ва ўсіх, – адказаў Піліпенка, – хутчэй дабіць ворага, дайсці да Берліна.

– Ну, а пасля? Кім хочаце стаць? Вырашылі?

– Вырашыў, таварыш маршал. Настаўнікам буду ў роднай Дуброўцы.

На твары маршала з’явілася ўсмешка.

– Справа добрая. Я таксама калісьці марыў аб гэтым. Але мы, камуністы, павінны быць там, дзе мы больш патрэбны. Перамога ўжо блізка, але, трэба меркаваць, ворагі ў нас яшчэ не хутка перавядуцца. Без арміі, без умелых баявых афіцэраў нам не абысціся. Ёсць думка накіраваць вас у вучылішча. Трэба стаць, дарагі сяржант, афіцэрам. Вельмі важная гэта прафесія – афіцэр – для краіны, для народа. Запомніце гэта.

Пасля Піліпенка не раз успамінаў словы маршала, адкрываючы ў іх усё больш глыбокі сэнс: нельга, выконваючы свяшчэнны абавязак, не аддаваць даручанай справе ўсе свае сілы і здольнасці. Гэта ён добра засвоіў і ў вучылішчы, і калі вучыўся ў Ваеннай акадэміі.

Міхаіл Карнеевіч марыў стаць настаўнікам. І ён стаў настаўнікам. Бо заўсёды лічыў першым камандзірскім абавязкам перадаваць маладым свае веды і вопыт, выхоўваць. Так было, калі камандаваў падраздзяленнем, часцю, калі стаў начальнікам вышэйшай ваеннай навучальнай установы.

Не толькі з будучымі афіцэрамі працуе камуніст Піліпенка. Ганаровы грамадзянін Кіева вядзе вялікую грамадскую і патрыятычную работу сярод працоўных сталіцы Украіны, моладзі. Аднак ніколі не забывае родных мясцін, людзей, якія дапамаглі стаць на ногі. Кожны прыезд на радзіму гэта незлічоныя сустрэчы з рабочымі, калгаснікамі, навучэнцамі, ветэранамі. Для кожнага ў яго знойдзецца добрае слова, мудрая парада, цёплы наказ. Паважае і ганарыцца сваімі землякамі генерал-лейтэнант Піліпенка, іх мужнасцю і няскоранасцю ў гады ліхалецця, працавітасцю ў мірны час.

**Гарбузаў, А. Вернасць мары / А. Гарбузаў // Звязда. — 1987. — 7 мая. — С. 3.**